Месцы для сядзення першага і другога класа, кнопкі выкліку правадніка і месцы для буйнагабарытнага багажу: БЧ пачынае эксплуатацыю новых цягнікоў «Штадлер»

# ВАГОНЧЫК ХУТКА КРАНЕЦЦА

**Беларуская чыгунка распачне пробную эксплуатацыю з пасажырамі трох новых сучасных пяцівагонных электрацягнікоў міжрэгіянальных ліній бізнес-класа. Новыя цягнікі пачнуць курсіраваць па маршруце Мінск — Гомель з 6 верасня. Карэспандэнт «Р» даведалася падрабязнасці.**

Пяцівагонныя электрацягнікі міжрэгіянальных ліній бізнес-класа (ЭПМ) вытворчасці кампаніі ЗАТ «Штадлер Мінск» адпавядаюць сучасным патрабаванням бяспекі руху і камфорту для пасажыраў. Базавай мадэллю для іх распрацоўкі сталі сямівагонныя электрацягнікі серыі ЭПМ, якія курсіруюць па БЧ са жніўня 2016 года. Максімальная хуткасць новых пяцівагонных электрацягнікоў складае 160 км/г.

Прэс-служба БЧ — аб абнаўленні парка маторвагоннага рухомага саставу:

— Новым маторвагонным рухомым саставам ЭПМ будуць ісці цягнікі № 716/715 Мінск — Гомель — Мінск з адпраўленнем з Мінска ў 07:08, з Гомеля — у 19:05 штодня, № 739 Гомель — Мінск з адпраўленнем з Гомеля ў 15:10 з панядзелка па чацвер, № 747 Гомель — Мінск з адпраўленнем з Гомеля ў 10:53 па пятніцах і нядзелях, № 748 Мінск — Гомель з адпраўленнем з Мінска ў 14:57 з панядзелка па пятніцу і ў нядзелю.

Як выглядаюць новыя цягнікі? У салоне прадугледжана 262 месцы для сядзення першага і другога класа. У зоне першага класа, гэта значыць павышанай камфортнасці, — 16 месцаў. Тут устаноўлены камфартабельныя скураныя крэслы са спінкай, якая рэгулюецца па вугле нахілу, і індывідуальнымі падлакотнікамі. Зона першага класа аддзеленая шкляной перагародкай. Таксама пасажырскі салон гэтага класа абсталяваны кнопкамі выкліку правадніка. Прадугледжаны месцы для размяшчэння буйнагабарытнага багажу, гардэроб для верхняга адзення. У салонах другога класа ўсталяваны мяккія сядзенні з падлакотнікамі па сістэме «3+2».



Новы рухомы састаў будзе задзейнічаны на найбольш запатрабаваных у пасажыраў электрыфікаваных участках БЧ.

ФОТА ПРАДАСТАЎЛЕНА ЗАТ «ШТАДЛЕР МІНСК»



У салоне прадугледжана 262 месцы для сядзення першага і другога класа.

> «На БЧ паступіла ўжо тры электрацягнікі, пастаўка астатніх сямі запланаваная на 2021—2022 гады»

Таксама ў цягніку прадугледжаны месцы для праезду людзей з парушэннем функцый апорна-рухальнага апарату.

— Кантракт на пастаўку дзесяці сучасных пяцівагонных электрацягнікоў серыі ЭПМ быў падпісаны паміж Беларускай чыгункай і кампаніяй ЗАТ «Штадлер Мінск» у 2019 годзе, — удакладнілі ў прэс-службе ЗАТ «Штадлер Мінск». — Цяпер на БЧ паступіла ўжо тры электрацягнікі, пастаўка астатніх сямі запланаваная на 2021—2022 гады.

Новы рухомы састаў будзе задзейнічаны на найбольш запатрабаваных у пасажыраў электрыфікаваных участках БЧ. Дарэчы, сёння на беларускай магістралі эксплуатуецца 18 сучасных электрацягнікоў вытворчасці швейцарскай кампаніі Stadler, якія курсіруюць па маршрутах гарадскіх, рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній бізнес-класа.

**Іна ГАРБАЦЕНКА**
gorbatenko@sb.by